View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository



**Л.П.Леська.**

# Вобраз Музыкі ў мастацкім свеце Яна Баршчэўскага

Да вобраза Музыкі ў розныя часы звярталіся беларускія пісьменнікі і паэты:

П. Багрым, А.Вярыга-Дарэўскі, А.Міцкевіч, А.Ходзька, У.Сыракомля, Я.Купала, Я.Колас, М.Багдановіч.

Асаблівасці абмалёўкі вобраза Музыкі шырока даследаваны беларускай крытыкай, ёсць першыя крокі ў разуменні гэтага пытання на матэрыяле твораў Яна Баршчэўскага. Н.Перкін заўважыў, што ў творах Я.Баршчэўскага " знікае бесклапотны пясняр беларускіх вёсак", і замест яго паўстае чалавек, які, "аддаўшыся фантазіі, балюча і дарэмна б'ецца над вырашэннем вялікай загадкі жыцця" (13, с.205) і знаходзіць "супакаенне толькі на ўлонні прыроды, яму здаецца, што ў сучасным грамадстве людзі парушылі першапачатковы закон … і толькі ў некранутай натуры можна знайсці заспакаенне ад жыццёвых нягод…"(13, с.205). Не заўсёды Музыка, паводле назіранняў беларускіх вучоных, хаваецца ад выпрабаванняў, ён імкнецца "заспяваць для людзей гімн велічны, які развее чорныя хмары і абудзіць скалы…"(11, с.34). Рамантычны герой са зборніка "Шляхціц Завальня…" , па справядлівай заўвазе В.Каваленкі, мае невыразнае ўнутранае і знешняе аблічча.

Задачай нашай працы стала даследаванне духоўнага свету Музыкі, асэнсаванне ролі вобраза ў фарміраванні ідэйна- тэматычнай цэласнасці творчай спадчыны Яна Баршчэўскага.

У "Нарысе Паўночнае Беларусі" Музыка як рэальны і дзейсны герой не прысутнічае, але аўтар вылучае таямнічы голас знакамітай дуды, які дае знак для пачатку танцаў пад адкрытым небам. Усе прысутныя, паводле апісання Яна Баршчэўскага, скачуць да поту, іх радасць пераступае межы прыстойнасці. Нават журботныя плакальшчыцы, якія нядаўна заліваліся над магілаю мужа і бацькі, скачуць пад мелодыю дуды. Карнавальная перакуленасць яднае спакутаваны вясковы люд у непарыўную масу. Выражанай з'яднанасці паміж Музыкам і народам не назіраецца на старонках зборніка "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях".

У апавяданні першым аўтар апісвае спрэчку паміж Грышкам- дударом і чарнакніжнікам Парамонам. Дудар смела абвінавачвае страшнага ведзьмака пагражае яму: "Варта было б за твае хлуслівыя чары кіем падзякаваць, ды так,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

каб і з зямлі не ўстаў.”(3, с.102). Нескаронасць героя, не падабаецца Парамону. Той таямніча паўздзейнічаў і Музыка пачаў іграць нейкага шалёнага казака, “госці крычаць, просяць, каб іграў “Цярэшку”…. Ён не зважае на гэта, нікога не слухае, а ўсё грае ды грае без усякага ладу.” (2, с.102) Музыка страчвае сваю магічную сілу і ў апавяданні “Радзімы знак на вуснах”. Дудар Ахрэм абвінававацiў карчмарку Праксэду ў вядзьмарстве, у хуткім часе яго завабілі нячысцікі. Таямнічыя прыгоды Ахрэма падаюцца аўтарам як апавяданне ў апавяданні. Пісьменнік заўважае: “доўга дудар быў хворы, а пасля пра тое здарэнне так апавядаў: “Калі выйшаў з карчмы і, спяваючы вяртаўся да хаты, сустрэў мяне на дарозе нехта нібыта знаёмы, голасам і постацю зусім падобны да кума…” (3, с.158). Размаўляючы з незнаёмцам Ахрэм дайшоў да вёскі, у кумавай хаце гарыць святло і поўна гасцей, просяць каб які вясёлы танец ім зайграў. Дудар іграў з імпэтам, нястомна кружылася кола танцораў. “Граў ноч навылёт, а… здавалася – не больш за гадзіну.”

Музыка знаходзіцца на мяжы двух мастацкіх прастор: бытавой, рэальнай і чарадзейнай, фантастычнай.

Існаванне героя выяўляецца ў геаметрычных вымярэннях і фігурах. У рэальнай прасторы Дудар дзейнічае ў гарызантальнай паверхні, рух героя падаецца як прамая лінія, якая змяняецца колам- сімвалічным паказчыкам тлумнай чарадзейнай прасторы. Першай колападобнай пабудовай, у якой знаходзіўся Ахрэм з’яўляецца карчма Праксэды. Рэчыўны свет карчмы напоўнены прадметамі, якія маюць форму альбо лініі, альбо кола. “Праксэда пад час чарадзейства вешала белы ручнік на сцяне, падстаўляла вядро і з двух канцоў гэты ручнік дала.” (3, с.158). “Свісталі, нібыта нехта дзьмуў у рыльца, пустыя бутэлькі на стале, і ў кожным кутку што-небудзь падала на зямлю.”(3, с.157).

Скачкападобнымі вертыкальнымі рухамі актывізуецца дзейнасць чарадзейнай прасторы: “Тут раптам саскочыў велізарны кот з печы на дол.Убачылі гэта ўсе, пакінулі скакаць, а кот знік, быццам яго і не было.”(3, с.157). Ахрэм насмешліва і гулліва заспакойвае ўсіх прысутных, тлумачыць, што гэта нячысцік з’явіўся.

Пасля непрыемнага здарэння (бойкі паміж дударом Ахрэмам і лоўчым Міхасём) госці выйшлі з карчмы і пайшлі сваёй дарогаю, толькі Музыка быў акружаны колам нячысцікаў. Ён не распазнаў пад маскаю кума д’ябла, а нават з імпэтам іграў і прытуптваў, а вакол кружылася кола танцораў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дудар прайграў усю ноч напралёт: ”Калі на ўсходзе пачало світаць, начлежнікі, якія былі там прыходзяць у цёмны хваёвы гушчар і бачаць сядзіць на спарахнелай калодцы Ахрэм і іграе …”(3, с.115). Адзін з начлежнікаў паклаў яму руку на плячо і кажа: “…Што з табою зрабілася, каму ты граеш усю ноч у гэтым лесе.” Ледзь сказаў ён гэта, дуда выпала ў Ахрэма з рук, і сам ён увесь здранцвеў, твар пачарнеў, слова вымавіць не можа.”(3, с.115).

Музыкі ў апавяданнях са зборніка “Шляхціц Завальня…” страчваюць сілы, страчваюць інструменты, не чуюць голасу народа. Магчыма, па гэтай прычыне і распаўсюджваюцца па Беларусі ілжэмузыкі, ілжэпрарокі.

У апавяданнях “Рыбак Родзька”, “Рада” нячысцік выступае ў ролі Музыкі-уладальніка, захопніка чужой тэрыторыі. Гэта ён, усеўшыся на люстраной паверхні возера Расоны, падкурчыўшы ногі, граў на дудзе і гучна спяваў песню:

Пацяраў я дуду, іх-вох,
На паповым лугу, іх-вох,
А не дудка была, іх-вох,
Весяліла мяне, іх-вох,
На чужой старане, іх-вох. (3,с.90).

Гуллівыя спевы ілжэмузыкі-шайтана прыводзяць да роспачы сялян, якія, толькі мовячы пацеры, і, больш нічога не робячы, заспяшаліся дамоў. Аднак у апавяданні “Рада” жыхары вёскі Сітна прагналі Музыку-захопніка. Яны, як тлумачыць аўтар, выразна пачулі словы песні:

І Сітна маё,
І Глыбокае маё,
І Скобрыя маё,
І Шэвіна маё,
І Язна маё,
І Нешчарда маё,
І Няверда маё,
І Невельскае маё,
Як маё, дык маё і ўсё маё. (3, с.254).

Пачуўшы такія словы, сяляне спачатку спужаліся, але адзін смялейшы рыбак адважыўся…, “падышоў і ўбачыў, што нехта, вопраткаю і тварам падобны да асташа- барада шырокая, твар круглы…- сядзеў на гнілым пні і крычаў на ўсё горла. Думаючы, што гэта сапраўдны асташ спраўляе свае чарадзейныя абрады, рыбак сказаў: “Не прыўлашчай сабе нашы азёры і рэчкі,- і з усяе моцы шпурнуў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

камень,…з таго часу шайтан больш ніколі не спяваў.”(3, с.254). Учынак героя Яна Баршчэўскага сведчыць аб тым, што народ, хаця і нясмела, сам выбірае музыку, якую будзе слухаць. Відавочна, сяляне яшчэ да канца не распазнаюць ілжэмузыку, атаясамліваюць яго варожасць з нетутэйшасцю, але спевы нячысцікаў сялянам не да душы. Хор ухваляе Бога, спявае псалмы сляпы Францішак (апавяданне “Сляпы Францішак”), боскую Музыку стварае Арганісты Андрэй - першы прафесійны Музыка ў творах Я.Баршчэўскага.

Музычнай адукацыяй валодае галоўны герой паэмы “Жыццё сіраты”. Ён у параўнанні з Музыкамі са зборніка “Шляхціц Завальня…”- дударом Ахрэмам, дударом Грышка, не мае імені. Магчыма, Ян Баршчэўскі такім чынам не толькі акцэнтаваў увагу на прафесійнай падрыхтаванасці свайго героя, але і падкрэсліваў яго грамадзянскую актыўнасць. У першай частцы паэмы Музыка сваім граннем выклікае буру, якая павінна зруйнаваць хату апекуна, сваім спевам Музыка напалохаў Собаля:

Плач, багач, бо не возьмеш нічога з сабою,
На зямлі векаваць марыш марныя мары,
Аніўцям, што стаіць блізка смерць за табою,
І енк бедных пякельна раздзьмухваў пажары.( 2, с.365).

Ян Баршчэўскі малюе свайго героя ўсюдыісным. Ён сягае ў фантастычны свет, размаўляе з духам памерлага бацькі Сіраты, бачыць і чуе жыццё разнастайных духаў, пякельных і райскіх, затым, перажыўшы сон, Музыка і зноў сярод рэальных персанажаў. Сяляне зацікавіліся ім, абступілі, разглядаюць арфу-дзіўны інструмент, які паказвае на здольнасць героя разумець чужыя пакуты. Будова арфы нагадвае фігуру чалавека, а “струны – быццам бы з жылаў і нерваў чалавека….Выгнутая маса як…цела, для замацавання і нацягвання струнаў, каб яны пакутавалі, трымцелі і свой гук даносілі да творцы” (4, с.126). Спачувальныя адносіны Музыкі да чужых пакутаў, балеснае суперажыванне гору іншага чалавека- вызначальныя характарыстыкі духоўнага свету героя паэмы “Жыццё сіраты”- важныя аспекты яго грамадзянскай пазіцыі, першапачатак фарміравання якой, па нашаму меркаванню, прасочваецца на старонках апавяданняў “Таварыш у падарожжы”, “Летуценнік Севярын”.

Паводле зместу паэмы “Жыццё сіраты”, Музыка сустракаецца са сваім школьным сябрам Казарынам, які і пазнае ў таямнічым Музыку Летуценніка Севярына. Спатканне герояў вызначальнае для разумення прыроды Музыкі, этапаў яго станаўлення. Летуценнік Севярын у апавяданнях са зборніка “Шляхціц Завальня…”, быў адным з “лепшых вучняў, любілі яго настаўнікі…,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

часта атрымліваў узнагароды…, чытаў найбольш паэзію Фэакрыта, Геснера, Шымановіча… . Паўсюль ён бачыў Аркадзію, а ўсе людзі ў яго выяўленні былі наіўныя і шчырыя пастушкі … Словам, усюды ён сустракаў старажытны залаты век” (3, с.308). Але хутка ўсё скончылася, Севярын расчараваўся ў каханні, “першае каханне, да таго ж яшчэ нешчаслівае,-- найвышэйшая навука, пасля якое чалавек з увагаю пачынае чытаць кнігу свету, таямніцы сэрца, адносіны сяброў і блізкіх… Севярын зразумеў, што свет не рай, а людзі не анёлы.” (3, с.309). Пасля гэтага здарэння герой Яна Баршчэўскага страціў радасць у жыцці, ён быццам бы памёр, усюды бачыў толькі жахлівых жамярыц. Стан Севярына стаў яшчэ горшым пасля вандроўкі па родным краі, ён стаў падобны да “магільнай пліты”.

Пісьменнік пахаваў свайго героя ў першым зборніку і адрадзіў яго на старонках паэмы “Жыццё Сіраты” і аповесці “ Душа не ў сваім целе”. Два адрозныя воблікі Музыкі паўстаюць ў творах Яна Баршчэўскага. У паэме – гэта Музыка з арфаю за плячыма, вандроўнік, які не толькі ўдзельнічае ў грамадскім жыцці краіны, але і імкнецца спасцігнуць таямніцы жыцця. Выключнасць Музыкі падкрэслівае Альма- існасць касмічная, “быццам дух з свету лепшага”, магчыма,- гэта натхненне, муза, сімвалічная прырода гераіні да канца не зразумета намі. Мы мяркуем, што Альма падобная да Пліскі з верша “Гутарка з Пліскай” В.Каратынскага, якая пра сябе гаворыць:

Душа ў нас з любові саткана,
Маё цела імглы абалонка!(8, с.89).

Пліска і Альма дапамагаюць тым, хто выконвае выключную ролю ў грамадстве, але страціў веру ў свае сілы. Альма павучае героя не ўцякаць ад рэчаіснасці:

Не памогуць стогны і скаргі,
Вечны смутак і пакуты.
Хай боль песні, гукі арфы
Будуць як уздых пачуты… (3, с.370).

Яна заклікае героя разносіць па свеце пагалоску пра цяжкае жыццё, пра пакуты, якія, па меркаванню таямнічай існасці, з’яўляюцца сродкам выпраўлення сапасаванага свету. Музыка Баршчэўскага напачатку сам пакутуе ад нячысцікаў, затым ён сузірае чужыя пакуты, потым разносіць пагалоску пра народныя пакуты па ўсяму свету.У аповесці “Душа не ў сваім целе” Музыка, перажываючы пакутніцкі шлях сваёй краіны, страчвае свой інструмент. Урач Саматніцкі успамінае:” Прысеўшы і абапёршыся рукою на дзікую скалу, я

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

аддаўся сваім тужлівым мроям; раптам нейкі жыд з сухім панурым, змучаным тварам, худы ў доўгай вопратцы, набліжаючыся да мяне сказаў:

“Я- музыка без інструмента граю на габоі; падарожнічаў па многіх краінах, і усюды маё гранне прымалі з вялікім захапленнем. Можа пан дазволіць зайграць яму што- небудзь?

- Грай, што табе падабаецца,- адказваю.

Ён скрывіў вусны, прыціснуў праваю рукою надзьмутыя грудзі, па твары прабеглі канвульсіўныя дрыжыкі- зайграў нейкі жалобны марш”.(3, с.322). Саматніцкі, гледзячы на канвульсіі твару і на ягоныя грудзі, не мог заставацца абыякавым і папрасіў, каб не граў болей, не падрываў сваё здароўе, а потым запытаў невядомага Музыку:

- Ты ведаеш лепш за мяне гэты сад, ці ёсць тут кусты цярноўніку?
- Навошта шукаць кусты цярноўніку?

Навошта шукаць кусты цярноўніку,- адказвае,- глянь уверх, над галавою расце велізарнае дрэва…(3, с.232). Саматніцкі ўзняў вочы ўверх і ўбачыў высокую акацыю з вялікімі і вострымі калючкамі.

Мы схіляемся да думкі, што ўрач Саматніцкі і нейкі невядомы Музыка без інструмента – двайнікі. Музыка- галоўны персанаж падсвядомага жыцця ўрача Саматніцкага, як заўважае аўтар, ён паўстаў як вынік тужлівых мрояў.

Метамарфозы Музыкі ў творах Яна Баршчэўскага выяўляюць ідэйна-тэматычнае адзінства мастацкага свету пісьменніка.

Літаратура:

1. Баршчэўскі Я. Творчасць Яна Баршчэўскага на старонках альманаха “Незабудка” // Веснік Віцебскага дзяржаўнага універсітэта. №4, 1997, С.47-50.

2. Баршчэўскі Ян. Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апвяданнях / Уклад., пер. з польскае мовы і камент. М.Хаустовіча.- Мн.,1990.-383с.

3. Баршчэўскі Я. Выбраныя творы / Укладанне, прадмова і каментарыі М.Хаустовіча – Мн: “Беларускі кнігазбор”, 1998.- 480с.

4. Каваленка В.А. Вытокі. Уплывы. Паскоранасць. Развіццё беларускай літаратуры 19-20 стагоддзяў. Мн.,1975, 336с.

5. Карантынскі В. Творы / Уклад., прадм. і камент. У.Мархеля.- Мн.,1994.-406с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

6. Конан У. Беларускі Музыка- Арфей // Полымя, 1992, №11.С.149-158.

7. Конан У. Цыклічная структура лірыкі: Паэзія Якуба Коласа // Роднае слова. 1996. № 9. С.44-51.

8. Конан У. Універсальны сімвал творчасці і мастацкага генія: Арфічныя матывы ў беларускім фальклоры // Мастацтва. 1998. №10, С.2-5.

9. Конан У. "Я паціху песні сумныя пяю…": Цыклічная структура лірыкі Максіма Багдановіча // Роднае слова. 1997. №4. С.20-33.

10.Макарэвіч А.М. Праблема жанравых мадыфікацый у беларускай прозе 19- пачатку 20 ст.: Манаграфія .- Выдавецтва Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А.Куляшова, 1999- 332с.

11.Мельнікава З.П. Канцэпцыя мастака і абставін у паэме "Сымон-Музыка"// Роднае слова", 2000. №5,с.

12. Ник.Як. Никифоровский. Очерки Витебской Белоруссии.(Дударь и музыка) // Этнографическое обозрение. 1892.№2. М.1892.,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ЛЕСЬКА ЛІЛІЯ ПЯТРОЎНА.

СТ.ВЫКЛАДЧЫК КАФЕДРЫ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ФАКУЛЬТЭТА БЕЛАРУСКАЙ ФІЛАЛОГІІ І КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ПЕДАГАГІЧНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ МАКСІМА ТАНКА.

ТЭМА ДАКЛАДА "ВОБРАЗ МУЗЫКІ Ў МАСТАЦКІМ СВЕЦЕ ЯНА БАРШЧЭЎСКАГА".

220809, МІНСК, ВУЛ. САВЕЦКАЯ, 18, ПАКОЙ 507. КАФЕДРА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ.

МІНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ, МІНСКІ РАЁН, В.СТАРЫНА, ВУЛ.ЗЯЛЁНАЯ, 23., ТЭЛ. Хатні: (8-017) 228-85-98,
працоўны :(8-017) 268-79-17.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ